УДК 81’373.21(476.4)

**Сяргей Крыжэвіч, Аляксандр Крыжэвіч**
(Крычаўскі раён, Магілёўская вобл., Беларусь)

# ГІСТОРЫЯ І ТАПАНІМІКА ВЁСКІ ЧЫРВОНАЯ БУДА КРЫЧАЎСКАГА РАЁНА

На зямлі нашай Бацькаўшчыны, бадай, не знойдзеш аніводнай народнай назвы, якая б узнікла выпадкова ці пазбаўлена значэння, без якой–небудзь прычыны. Сам народ ніколі не назаве сваё паселішча словам, якое ў чымсьці не адпавядала б, а тым больш пярэчыла б ісціне [1]. Так сцвярджае ў сваёй выдатнай кнізе ***“Назвы зямлі беларускай”*** гісторык Леанід Міхайлавіч Лыч. Больш за тое, мясцовыя геаграфічныя назвы – гэта выяўленне ментальнасці людзей, іх светаўспрымання, культуры побыту, звычаяў і нават псіхалагічнага стану. Тапонімы з’яўляюцца храналагічным сведчаннем гістарычных падзей. Яны змяняліся ў часе па форме, змесце і распаўсюджваліся ў залежнасці ад канкрэтных гістарычных падзей. Кожная гістарычная эпоха характарызуецца сваім наборам тапонімаў [2]. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што высветліўшы незразумелую назву горада ці вёскі, мы лепш пачынаем разумець мінулае сваіх продкаў, іх асаблівасці жыццядзейнасці, звычкі і норавы. Натуральна, гэта дапамагае больш глыбока і шматгранна ведаць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

і ўяўляць мінуўшчыну нашай малой радзімы і Бацькаўшчыны ў цэлым. Нельга не адзначыць, што тапонімы нашай краіны – гэта найкаштоўнейшыя моўныя і гістарычныя помнікі роднай зямлі, якія патрэбна шанаваць і рабіць усё магчымае, каб іх захаваць, а пасля перадаць наступным пакаленням.

У дадзеным матэрыяле аналізуецца мікратапаніміка вёскі Чырвоная Буда, а таксама праводзіцца класіфікацыя найменняў і тлумачыцца іх этымалогія. Аднак робяцца толькі першыя крокі ў зборы і асэнсаванні тапанімікі вёскі Чырвоная Буда, што знаходзіцца ў Крычаўскім раёне. Дарэчы, вёскі з такой самай назвай ёсць не толькі ў Крычаўскім, але таксама ў Чавускім і Добрушскім раёнах. Аналізам і сістэматызацыяй тапанімікі вёскі Чырвоная Буда ніхто не займаўся, пагэтаму відавочна актуальнасць выбранай тэматыкі даследавання. І гэта нягледзячы на тое, што крыніцы інфармацыі на сёння даступны амаль кожнаму, а мінімальная зацікаўленасць краязнаўствам і гісторыяй малой радзімы дае магчымасць сабраць шмат звестак па лакальнай гісторыі. Важна адзначыць і тыя разнастайныя метады, якія прымяняюцца ў структуры дадзенага невялікага даследавання: этымалагічны, гістарычны (гісторыка-храналагічны аналіз), геаграфічны. Пры гэтым трэба ведаць, што тапаніміка – самастойная навука, якая сфарміравалася на стыку трох дысцыплін (лінгвістыка, гісторыя і геаграфія), што і фарміруюць метады яе даследвання. Раскрыццё тэмы мусіць паказаць, што з'яўленне мясцовых тапонімаў – гэта працэс расцягнуты ў часе, абумоўлены цэлым шэрагам гістарычных акалічнасцяў, а таксама рознымі мясцовымі асаблівасцямі.

Вывучэнне мікратапонімаў роднай зямлі стала не проста важнай справай, але і актуальным навуковым напрамкам. Кожнае даследаванне ў галіне тапанімікі толькі спрыяе працэсу абуджэння гістарычнай памяці народа, вяртанню яго да сваіх вытокаў, сваёй гісторыі. Каб разабрацца з гісторыяй сённяшняй вёскі Чырвоная Буда, спачатку трэба звярнуць увагу на слова “буда”, якое з'яўляецца найважнейшым у дадзеным найменні. Тэрмін “буда” з'яўляецца даволі старажытным і абазначае невялікую будыніну, часовае жыллё. Этымалогія слова звязана з дзеясловам *будаваць* і іншымі падобнымі па кораню словамі каштлату *будка*, *будан* і інш. Разам з тым, на беларускіх землях “будамі” ў XVI–XIX стагоддзях называлі невялікія прадпрыемствы, якія знаходзіліся ў прыватнай уласнасці і займаліся смалакурэннем, гонкай дзёгцю або выпальваннем драўлянага вугалю ці вытворчасцю паташу [3]. Некаторымі навукоўцамі таксама выказвалася меркаванне аб тым, што гэтым словам першапачаткова называлі пасяленні ў лесе на месцы вырубак. Між іншым, на развіццё лясных промыслаў моцна ўплывала ажыўленне гандлёвых адносінаў, якое патрабавала выкарыстання прыродных багаццяў. Паступова жыхары вытворчых паселішчаў пераставалі займаццаляснымі промысламі, але назва Буда за імі замацавалася і дайшла да нашага часу [4]. Слова “буда” даволі часта сустракаецца ў найменнях населеных пунктаў Беларусі, бо іх існуе больш чым 150 назваў. Такім чынам, прааналізаванае слова “буда” характэрна для нацыянальнага тапанімікона, што пацвярджаюць вышэйпрыведзеныя аналіз і факты. І як тут не пагадзіцца з меркаваннем шаноўнага Леаніда Лыча, што працавіты беларускі народ любіў спрадвеку называць месцы свайго пражывання словамі, якія ўвасаблялі характэрны для таго ці іншага куточка нашай зямлі від вытворча-гаспа-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

дарчай дзейнасці. Цікава, што географы вылучаюць "буду" як асобны гістарычны тып сельскага паселішча, якому, па іх меркаванню, даследчыкі не надавалі належнай увагі. Адной з асаблівасцяў, характэрных для такога віда паселішча з'яўляецца яго размяшчэнне ў лясным масіве [5].

Паселішчы Буда ўзнікалі і недалёка ад чыгункі ў ХІХ – пачатку ХХ ст., калі на тэрыторыі Беларусі сталі развівацца чыгуначныя камунікацыі. У будах жылі рабочыя, што займаліся абслугоўваннем чыгуначнага палатна. З цягам часу такія прымітыўныя буды сталі месцам пастаяннага пражывання людзей [6]. Аднак такая з'ява дакладна не характэрна для Чырвонай Буды, хоць вёска і актыўна развівалася ў ХІХ стагоддзі. Менавіта гісторыя ўзнікнення паселішча дае магчымасць зразумець, адкуль ўзялася назва ў канкрэтным выпадку. Вёска Чырвоная Буда, як расказваюць вясковыя старажылы, словы якіх пацвярджаюць архіўныя дакументы, калісьці мела назву Жыдова Буда. Яна была невялікай і малапрыкметнай, таму пісьмовых звестак пра яе гісторыю засталося зусім нямнога, аднак згадваецца па пісьмовых крыніцах яшчэ з XVIII стагоддзя. Вядома, што раней у Хатавіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерніі, на месцы цяперашняй вёскі, знаходзіўся шляхецкі фальварак, пад назвай "Сярэбраны Ручай". Сваёй назвай, згодна народнаму паданню, фальварак быў абавязаны ручаю, які працякаў побач з маёнткам. Ручай меў, як кажуць, крыштальна чыстую, празрыстую ваду і пераліўнае цячэнне, якое нагадвала звон срэбра. У сярэдзіне ХІХ стагоддзя ім валодалі Адольф і Мальвіна Валукевічы. Пасля смерці бацькоў, у 1874 годзе фальварак перайшоў у спадчыну іх дзецям – Эдуарду і Юліі Валукевічам. Вядома таксама, што яны не жылі ў фальварку, а здавалі яго ў арэнду крычаўскаму мешчаніну іудзейскага веравызнання Маісею Левітану. Важна адзначыць, што ўладанні пад агульнай назвай "Сярэбраны Ручай" былі ў вёсках Жыдова Буда і Сярэбраны Ручай і складалі 300 дзесяцін зямлі.

У 1875 годзе арандатар пабудаваў каля фальварка *дзегцярны завод* ці ***буду***. З-за ўзнікшай буды фальварак "Сярэбраны Ручай" пачалі называць "Жыдовай Будай" [7]. Зразумела, што на тапонім паўплывала этнічнае паходжанне арандатара фальварка, якое было іншым у адрозненні ад сялянаў-беларусаў. Нічога дзіўнага ў гэтым няма, бо як сцвярджаюць этнографы, этнічныя вобразы з'яўляюцца важным складнікам у карціне свету любога народа, паколькі дазваляюць не толькі абагульніць і аптымізаваць уяўленне пра сябе саміх, але і выразна пазначыць на ўзроўні калектыўнай свядомасці спецыфічныя рысы прадстаўнікоў іншай этнічнай групы, што ў сваю чаргу надае змястоўную характарыстыку і прасторы іх пражывання [8]. У 1880 годзе на згаданым заводзе былі 1 майстар і 4 стала працуючыя рабочыя. За год на прадпрыемстве выраблялася 1700 пудоў дзёгця. У 1880 годзе ў фальварку з 300 дзесяцін зямлі 201 дзесяціна была занята гаспадарскім лесам, 20 дзесяцін заняты пашай і 42 дзесяціны былі ворыўнымі землямі. У 1883 г. вёска складала 32 двары, 159 жыхароў і знаходзілася ў Хатавіжскай воласці Клімавіцкага павета. На ручаі, які працякаў побач з фальваркам, знаходзіўся вадзяны млын, за арэнду якога Маісей Левітан плаціў 100 рублёў у год. Пастунова на тэрыторыі фальварка пачалі сяліцца людзі. Так і ўзнікла вёска, якая, як і фальварак, мела назву "Жыдова Буда". Яна размяшчалася ўздоўж тракта на Маскву. У 1904 годзе за-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

снаваны вінакурны завод, а побач быў фальварак, у якім жылі 25 чалавек. У 1909 годзе ў вёсцы было 28 двароў, дарослага насельніцтва пражывала 199 чалавек (з іх 98 – мужчыны і 101 – жанчыны). Вёска Жыдова Буда адносілася да Дамамерыцкага царкоўнага прыходу. Сваёй школы і царквы вёска ў той час не мела [9].

Пасля ўсталявання ўлады бальшавікоў на тэрыторыі Беларусі назва вёскі была зменена. Так, на геаграфічнай карце замест назвы Жыдова Буда з’явілася назва Чырвоная Буда. Арыентуючыся на тую інфармацыю, што апублікавана ў кнізе “Памяць”, адзначым, што ў 1931 годзе быў арганізаваны калгас “Чырвоная Буда”, які аб’ядноўваў 36 гаспадарак. На дзясятак гадоў раней, у 1919 годзе, была адкрыта працоўная школа 1-й ступені. У 1926 годзе вёска ўжо мела 54 двары і 332 жыхары [10]. Чаму ранейшая назва была зменена на Чырвоную Буду вельмі проста патлумачыць, бо чырвоны сцяг – колер рэвалюцыі і прыхільнасці да ўлады Саветаў. Да таго ж вядома, што ідэалогія бальшавікоў практычна не ўлічвала этнічнае паходжанне і нацыянальныя фактары, імкнучыся да камунізма і сусветнай рэвалюцыі. Невядомы і дакладны час перайменавання, бо ў кнізе “Памяць” пазначана, што вёска насіла старую назву да 1935 года, аднак гэта выклікае пэўныя сумневы. Вышэйпрыведзеныя звесткі даюцца для таго каб зразумець, што вёска, да прыходу бальшавікоў з іх ідэалогіяй, ужо практычна сфармавалася са сваёй мікратапанімікай, аднак працэс фармавання назваў паселішча працягваўся таксама пры савецкай уладзе. Важна адзначыць, што адразу пасля вайны ў 1950 годзе быў арганізаваны калгас “Чырвоны партызан”. Пагэтаму сёння вельмі часта можна пачуць назву “Партызаны”, аднак маецца на ўвазе Чырвоная Буда. Па афіцыйных дадзеных у часы акупацыі нямецкім войскам тутэйшых зямель дзейнічала падпольная група пад кіраўніцтвам А. Крупадзёрава, якая з цягам часу атрымала назву т. зв. “Міхееўскіх падпольшчыкаў” [11]. Іх гісторыя яшчэ патрабуе асобнага даследавання, бо пра падпольшчыкаў нямала скажонай і надуманай інфармацыі, а рэальнасць іх учынкаў не заўсёды адпавядае створаным ім вобразам. Гэтыя падзеі таксама паўплывалі на з’яўленне назвы “Партызаны”, што стала неафіцыйным найменнем Чырвонай Буды. У свядомасці тутэйшых жыхароў і нават гасцей вёскі неафіцыйная назва замацоўваецца з дапамогай вясковых помнікаў, прысвечаных падзеям апошняй страшнай сусветнай вайны: помнік падпольшчыкам і брацкая магіла савецкім воінам. Важна адзначыць і помнік землякам, якіх па афіцыйных дадзеных загінула 396 чалавек. Цікава, што мемарыялізацыя трагічных і гераічных падзей адбылася толькі ў 1967 годзе, калі быў усталяваны першы помнік загінулым вяскоўцам. Праз дзясятак год, у 1979 годзе, была пастаўлена стэла з выявамі полымя і мяча, у памяць аб дзейнасці падпольнай групы А.Крупадзёрава. Брацкую магілу чатыром загінулым савецкім воінам наогул стварылі толькі ў 1985 годзе [12].

Важнай часткай мясцовай тапанімікі з’яўляюцца назвы вуліц ці гадонімы. На жаль, гэтыя мікратапонімы не вылучаюцца ўнікальнасцю, сярод іх мала старадаўніх назваў, аднак, па вялікаму рахунку, савецкія гадонімы таксама заслугоўваюць увагі, і таму іх вывучэнне дапаможа аднавіць карціну развіцця такога вялікага паселішча Крычаўшчыны, як Чырвоная Буда. Зразумела, што пераважная частка вуліц мае назвы, якія з’явіліся за савецкім часам ці былі зменены ў часы панавання савецкай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ўлады. Перадусім варта адзначыць, што Чырвоная Буда падзяляецца на старую і новую часткі, а рэчка з цікавай народнай назвай Худабычка ў геаграфічным цэнтры вёскі штучна загачана і ўтварае цэлае возера, якое якраз з'яўляецца такой мяжой. У пасляваенны час, пачынаючы з канца 1950-х гг., галоўныя будынкі вёскі (сельсавет, сельскі клуб і школа) перабіраюцца ў тую частку, што на сёння знаходзіцца побач з аўтамабільнай шашой. Вёска па сённяшніх часах даволі вялікая, адсюль вынікае колькасць вуліц і завулкаў, што можна налічыць амаль паўтара дзясяткі.

Частка назваў звязана з важнымі аб'ектамі паселішча, што размяшчаюцца на вуліцах *Клубная, Школьная, Завадская*. Ад Школьнай вуліцы яшчэ ідуць ажно два Школьныя завулкі. Можна меркаваць, што гэтыя назвы з'явіліся ўжо ў савецкія часы, бо клуб і новая школа былі пабудаваны менавіта ў пасляваенны перыяд.

Некаторыя найменні паказваюць накірунак вуліцы (ці яе месцазнаходжанне), як то *Паўднёвая* ці *Каранецкая*, што вядзе ў бок вёскі Каранец. Другія абазначаюць прыродныя асаблівасці месца, як то *Яравая, Лугавая*. Асабліва цікавым найменнем сярод вясковых назваў з'яўляецца вуліца *Зарэчная*. Узнікла яно таму, што вуліца знаходзіцца па той бок рэчкі Худабычкі, адсюль і адпаведная назва. Па другі бок ад рэчкі таксама ёсць вуліца Рачная, што знаходзіцца ў новай частцы паселішча і з'яўляецца водгукам старой назвы. Другая катэгорыя назваў часткова мае народнае паходжанне, што ўзнікла яшчэ ў часы фарміравання паселішча і звязана з назіральнасцю простага народа і ўспрыняццем яго жыццёвай прасторы.

Такія назвы вуліц, як Саўгасная ці Міру маглі з'явіцца толькі ў савецкія часы, бо народных найменняў такіх не фіксуецца. Да іх, з пэўнай агаворкай, можна аднесці і вуліцу Пераездную. Гэтую назву можна звязваць з пракладкай чыгуначнай дарогі, што праходзіць недалёка ад вёскі. Завадская вуліца таксама можа звязвацца з савецкім перыядам гісторыі, бо прамысловы бум і масавае будаўніцтва заводаў пачалося менавіта ў савецкія часы, аднак менавіта гэтая частка вуліцы звязана з вінным заводам, што быў пабудаваны яшчэ ў пачатку ХХ стагоддзя. Аднак вуліца Зарэчная, а дакладней яе частка перайменавана ў Завадскую ўжо ў савецкія часы. Яна якраз перасякае вуліцу Саўгасную, і менавіта з гэтага моманту пачынаецца частка вуліцы пад назвай Маладзёжная. Такім чынам, цэнтральныя вуліцы вёскі маюць наступныя назвы: *Партызанская, Саўгасная і Маладзёжная*. Па найменню вёскі атрымала і назву вуліца Будзянская з прылягаючым да яе завулкам. Згаданая вышэй Лугавая вуліца вядзе да былога паселішча Сярэбраны Ручай, што да 1937 года мела іншую назву – Круты Роў, аднак перастала існаваць з сярэдзіны 2000-х гадоў.

Ёсць яшчэ надзвычай цікавы тапонім Чортава балота, пра які не згадваецца ў літаратуры [13]. А знаходзіцца ён практычна паміж чыгуначнай станцыяй Крычаў-2 і Чырвонай Будай, на выяздзе з вёскі, недалёка ад вуліц Міру і Пераезднай. Цікава, што гэтая назва, напрыклад, не фігуруе ў даволі падрабязным зборы разнастайнай тапанімікі Крычаўскага раёна ў часопісе "Магілёўскі мерыдыян" [14]. Як адзначаюць даследчыкі, падобныя назвы існуюць па ўсёй Беларусі. Пра такія мясціны можна пачуць розныя паданні пра чарцей ці зданей, пра заклятасць локуса. На сёння беларускія навукоўцы лічаць, што найменні звязаныя з чортам, як то Чортава

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Балота, вельмі старадаўнія. Такія назвы не толькі адсылаюць да нячыстай сілы, але і да старадаўніх хтанічных персанажаў і боствaў [15]. Грунтоўнае вывучэнне гэтага месца яшчэ наперадзе, зараз проста канстатуем, што мясцовы тапонім мае сапраўдныя народныя карэнні і звязаны з міфапаэтычнымі ўяўленнямі беларусаў. Цікава, што на сёння да Чортавага балота прылягае поле, якое штогод засяваецца. Падчас размоваў з крычаўскімі краязнаўцамі было высветлена знаходжанне на полі матэрыялаў XVII–XX стагоддзя (керамікі, манет і інш.). Гэта наводзіць на думку, што ваколіцы сённяшняй Чырвонай Буды магчыма былі заселены яшчэ ў XVIII стагоддзі.

Адзначым, што ў гэтай тэматыцы яшчэ можа быць далейшы працяг даследавання, бо практычна быў прыменены эмпірычны падыход разам з аналізам сабранай інфармацыі. Збор назваў водных аб'ектаў, элементаў рэльефа і іншых мікратапанімічных найменняў таксама карысны для пашырэння даследчай тэмы. Наступным этапам можа служыць вывучэнне картаграфічнай інфармацыі даваеннага часу, мапаў пачатку 20 стагоддзя, вывучэнне тапонімаў вакольных мясцовасцяў, што дасць яшчэ больш шырокае ўяўленне. Зразумела, што грунтоўная гутарка са старымі жыхарамі дасць дадатковую інфармацыю, што можна выкарыстаць у пастаўленых мэтах. Такім чынам, аўтары паспрабавалі прасачыць з'яўленне тапонімаў і звязаць з рознымі гістарычнымі эпохамі, падзеямі і адлюстраваць мясцовыя асаблівасці.

**Спіс літаратуры**


1. Лыч, Л. Назвы зямлі беларускай / Л. Лыч. – Мн., 1994. – С. 3.
2. Басик, С.Н. Общая топонимика : учебное пособие для студентов географического факультета / С.Н. Басик. – Минск : БГУ, 2006. – С. 3–4.
3. Лыч, Л. Назвы зямлі беларускай / Л. Лыч. – Мн., 1994. – С. 25–26.
4. Шчур, В. Беларускія ўласныя імёны. Беларуская антрапаніміка і тапаніміка / В. Шчур. – Мн. : Мастацкая літаратура, 1998. – С. 150.
5. Шарухо, И.Н. Исторические типы сельского расселения Беларуси: культурно-географические особенности / И.Н. Шарухо // Псковский регионологический журнал. – 2007. – Вып. 5. – С. 120.
6. Шчур, В. Беларускія ўласныя імёны. Беларуская антрапаніміка і тапаніміка / В. Шчур. – Мн. : Мастацкая літаратура, 1998 – С. 151.
7. Крыжэвіч, С. З гісторыі вёскі Чырвоная Буда / С. Крыжэвіч // Ленінскі кліч. – 1997. – 5 крас. – С. 2.
8. Лобач, У.А. Латвія і латышы ў традыцыйнай карціне свету беларусау Падзвіння XIX – першай паловы XX стагоддзя / У.А. Лобач // Веснік Полацк. дзярж. ун-та. Сер. А. Гум. навукі. – 2009. – № 7. – С. 51
9. Крыжэвіч, С. З гісторыі вёскі Чырвоная Буда / С. Крыжэвіч // Ленінскі кліч. – 1997. – 5 крас. – С. 2
10. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Крычаўскага раёна. – Маладзечна : Друк. «Перамога», 2004. – С. 702–703. Качанава А. Бои на восточном рубеже Могилёвщины [научный руководитель – учитель истории Крыжевич С.В.] // Гісторыя і грамадазнаўства. – № 5. – 2014. – С. 57–59.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

11. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць (АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш. – С. 283.

12. Ёсць перспектыва ў даследванні гэтай малавядомай мясціны на прадмет фіксацыі падання пра водны локус. Больш за тое, падаецца што грунтоўнае даследванне народнай тапанімікі, дасць магчымасць выявіць статус месца і яго палажэнне ў свядомасці тутэйшага селяніна.

13. Геаграфічна-статыстычны слоўнік магілёўскай вобласці. Частка XV. Крычаўскі раён / Магілёўскі мерыдыян. Т. 5–6. – Вып. 6. Актуальныя праблемы экалагічнай і эканамічнай геаграфіі. – С. 63–78

14. Сакральная геаграфія Беларусі / Людміла Дучыц, Ірына Клімковіч. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2011. – С. 103, 106

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова